*Вачыма продкаў*

# Праз церні ўбачыць даўнейшае

## Што такое Ведзьмерагіна і ці ёсць у нашай краіне свой Стоўнхендж?

**Адказы на гэтыя пытанні можна знайсці ў кнізе «Паміж небам і зямлёй: этнаастраномія». Яе аўтар — навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Цімафей АВІЛІН. У выданні ўпершыню ў гісторыі комплексна разглядаюцца традыцыйныя ўяўленні беларусаў пра астраномію. Карэспандэнту «Чырвонкі. Чырвонай змены» аўтар расказаў пра галоўныя асаблівасці народнага разумення космасу.**

***— Цімафей, адразу спытаю, пра што можна даведацца з кнігі?***

— Яна закранае ўсе аспекты ўспрымання беларусамі космасу. Я імкнуўся зрабіць выданне цікавым не толькі для навукоўцаў. Яго можна разглядаць і як навукова-папулярнае, і як энцыклапедыю. Можна чытаць спачатку, а можна адкрыць асобны артыкул і даведацца пра канкрэтнае сузор'е ці з'яву. Яшчэ адзін аспект магчымага выкарыстання — гэта сучасная інтэрпрэтацыя. Я спадзяюся, што сабраная інфармацыя стане падмуркам для развіцця тэмы ў мастацтве, дапаможа нашым пісьменнікам, мастакам.

***— А ці шмат адрозненняў у нашай этнаастраноміі ад класічнай еўрапейскай — старажытнагрэчаскай?***

— Памылкай будзе лічыць, што ў аснове сучаснай астраноміі ляжыць грэчаская міфалогія. Справа ў тым, што грэчаскае тлумачэнне гісторыі назваў сузор'яў было сфарміравана і ўведзена ў навуковы ўжытак толькі ў XIX стагоддзі на аснове тэкстаў толькі некалькіх антычных аўтараў. Але ж кожны народ выбудоўваў сваю міфалагічную сістэму, не выключэнне і Беларусь. Частка нашай астранамічнай міфалогіі заснавана на побытавых з'явах (Арыён — Касцы, Вялікая Мядзведзіца — Воз), частка — на біблейскіх уяўленнях (напрыклад, гісторыя Віфлеемскай зоркі, легенда пра Млечны шлях як разлітае святымі малако).

Мы маем з суседзямі шмат агульнага. Напрыклад, тэрмін «Ведзьмерагіна», які на беларуска-літоўскім памежжы называюць Венеру, утвораны ад беларускага слова «ведзьма», і літоўскага «рагіна», што азначае... таксама «ведзьма». Такое вось узаемапранікненне.



**Нават калі неба зацягнута аблокамі, кемлівы этнаастраном знойдзе выйсце.**

**«Я імкнуўся змяшчаць максімальна дакладныя даныя, не міфалагізуючы нашу астраномію. Бо многае з таго, што мы ведаем пра беларускае разуменне космасу, штучна створана ў параўнальна нядаўнія часы».**

Кожны народ успрымае начное неба праз прызму сваёй культуры, таму сабраныя намі звесткі па этнаастраноміі — гэта ўнікальны падмурак для навукоўцаў з самых розных сфер: мовазнаўства, этнаграфіі, фалькларыстыкі і іншых.

***— Па якіх крыніцах можна вывучаць «народную» астраномію цяпер?***

— У першую чаргу варта назваць экспедыцыйную дзейнасць. Старыя людзі ў вёсках дагэтуль памятаюць шмат цікавага па тэме. Я сам нярэдка збіраю пэўныя звесткі падчас паездак. Не менш важны і аспект дакументальных запісаў, нешта можна знайсці ў летапісах і іншых дакументах, нешта — у працах замежных калег.

Зазначу, што ўсе звесткі — дакументальна пацверджаныя. Я імкнуўся змяшчаць максімальна дакладныя даныя, не міфалагізуючы нашу астраномію. Бо многае з таго, што мы ведаем пра беларускае разуменне космасу, штучна створана ў параўнальна нядаўнія часы.

***— Напрыклад?***

— Скажам, тэрмін «Мілавіца», які часта ўжываюць у дачыненні да Венеры. Насамрэч беларусы так не казалі. Гэтую планету называлі па-рознаму: у першую чаргу — Заранкай ці Вечарніцай (з-за добрай бачнасці ранкам і ўвечары), Віфлеемскай зоркай, Зярніцай, Воўчай зоркай, Мядзведзіцай, Дар'яй і Мар'яй, але ніколі — Мілавіцай. Ці ўзяць слова «знічка» — яго таксама не было да пэўнага часу ў нашай лексіцы ў такім значэнні. Знічкай называлі дзяўчыну, якая знікае і з'яўляецца ў іншым месцы.

Дарэчы, цікава, што некаторыя з гэтых міфаў становяцца рэальнасцю. Прыязджаеш у вёску, чуеш там ад кагосьці — «зорка Венера». Пытаешся, адкуль ведаюць такія словы, а табе ў адказ: «Дык так жа ў Багдановіча».

Ёсць і вельмі спрэчныя рэчы, з якімі я таксама паспрабаваў разабрацца. Напрыклад, наяўнасць старажытных беларускіх абсерваторый кшталту Стоўнхенджа. Некаторыя лічаць, што такія збудаванні знаходзіліся ва ўрочышчы Купа ў Аршанскім раёне і на возеры Янова каля Полацка, але сказаць, ці дакладна капішчы на гэтых месцах будаваліся ў астранамічных мэтах, немагчыма. У вёсцы Пашэвічы кажуць пра валун з лункамі, якія нібыта адлюстроўваюць частку зорак з сузор'яў Андрамеды і Касіяпеі, але гэта таксама цяжка пацвердзіць.

***— А ці была ў беларусаў свая астралогія?***

**«Частка нашай астранамічнай міфалогіі заснавана на побытавых з'явах (Арыён — Касцы, Вялікая Мядзведзіца — Воз), частка — на біблейскіх уяўленнях (напрыклад, гісторыя Віфлеемскай зоркі, легенда пра Млечны шлях як разлітае святымі малако)».**

— Калі казаць пра наша традыцыйнае яе ўспрыманне — са знакамі задыяка, па якіх можна вызначаць лёс, — то наўрад ці нашы продкі мелі такую сістэму. Але пэўныя элементы прадказання будучыні пры дапамозе зорак сустракаюцца. Скажам, у Веткаўскім раёне мне распавядалі пра бабак-павітух, якія пасля нараджэння дзіцяці выходзілі паглядзець на начное неба, каб прадказаць яго лёс. Як яны гэта рабілі, сказаць цяжка. Хутчэй за ўсё, сачылі за размяшчэннем самых яркіх зорак на небасхіле, наяўнасцю метэораў, гэта і ўказвала на будучыню нованароджанага.

***— Калі падагульніць, ці моцна наша традыцыйная астралогія адрозніваецца ад агульнапрынятай?***

— Так, гэта нават тэрміналагічна адсочваецца. Скажам, у нас не было спецыяльнага слова для абазначэння сузор'яў, у вёсках звычайна кажуць або «зорка», або «купка зорак», маючы на ўвазе іх групу. У літаратуры ўжываліся розныя тэрміны, нават лацінскія — «канстэлацыя», але «народнага» слова не было. Толькі ў пачатку мінулага стагоддзя з'явілася адпаведнае абазначэнне. Дарэчы, Вацлаў Ластоўскі прапанаваў свае словы — «спагвездзе», але ў мове замацавалася «сузор'е».

Ці ўзяць тую ж «зорку» — толькі на тэрыторыі Беларусі шырока ўжывалася тры тэрміны: «зорка», «звязда» і «гвязда».

Зазначу, што я ні ў якім разе не прапаноўваю замяніць усе існуючыя тэрміны ўласнабеларускімі. Але ведаць сваё — варта. Гэта як ведаць некалькі моў — любому чалавеку не зашкодзіць.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Што ні край...*

# У ГАСЦЯХ У ЭТНАКАЗКІ

**Адправіцца ў такое падарожжа вам прапануе Сяргей Воранік. Некалькі гадоў таму хлопец скончыў факультэт турызму і сэрвісу Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, пасля працаваў у мясцовым турбюро. Там Сяргей і распрацаваў арыгінальны маршрут — «Падарожжа ў этнаказку», які палюбіўся беларускім аматарам вандровак і турыстам з розных краін свету. Не так даўно 25-гадовы юнак атрымаў за свой праект міжнародную прэмію «Садружнасць дэбютаў». Яна была заснаваная ў 2009 годзе з мэтай падтрымкі творчасці моладзі ў дзяржавах — удзельніцах СНД.**

— Праект наш міжнародны: стваравўся як беларусамі, так і палякамі, — расказвае хлопец. — Перад намі стаяла мэта павысіць прывабнасць трансгранічнага рэгіёна Гродзеншчыны. Праведзеная праца — плён супрацоўніцтва экскурсаводаў, гісторыкаў і краязнаўцаў. Кіраўнік праекта і мой ідэйны натхняльнік — дацэнт, кандыдат гістарычных навук Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Віталь Карнялюк — раздаў кожнаму заданні. Я вывучаў карту і знаходзіў на ёй цікавыя і нязведаныя мясціны са сваім непаўторным побытам.

Атрымаліся чатыры асноўныя маршруты: «Цуд народнага мастацтва», «Гасцінцамі Белуна», «Сотні гадоў разам: слядамі яўрэйскай культуры», «Дарогамі драўлянага дойлідства». Туры мабільныя, пры жаданні іх можна змяняць, на заўгодна. Пакуль выезд — толькі з Гродна. Але зараз я «перацягваю» экскурсіі і ў сталічную фірму, дзе працую. Хачу, каб больш людзей знаёмілася з нашай гісторыяй і культурай.

***— Чым адметныя твае «чароўныя» маршруты?***

— Мы робім акцэнт на этнакультуру. Самы папулярны маршрут — «Гасцінцамі Белуна». У беларускай міфалогіі ён — бог удачы, шчасця, поспеху, заступнік падарожнікаў. Паводле легенды, гэты сівавалосы, доўгабароды дзядок дапамагаў выйсці заблукаўшым вандроўнікам з цёмнага лесу. І сёння кажуць: «Цёмна ў лесе без Белуна».

**«Сёння мала проста здаць гасцям хатку, прапанаваць ім пайсці на рыбалку ці пакатацца на веласіпедзе. Трэба дапаўняць адпачынак культурнай праграмай, знаёміць гасцей з нашымі абрадамі і звычаямі, нацыянальнай кухняй».**

Слова «гасцінец» паходзіць ад старажытнаславянскага «госць» — падарожнік, іншаземны купец. Як вядома, беларусы заўсёды славіліся сваёй гасціннасцю і лагоднасцю. Гэта наш менталітэт. Прыгадайце, напрыклад, што дзверы ў хатах ў вёсках ніколі не замыкалі, а гаспадары з радасцю сустракалі кожнага мінака.



Нашу экскурсію па Гродне мы пачынаем з легенды. Потым ідзём глядзець Лідскі замак, Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей, Адэльскі музей драўляных народных інструментаў. Дарэчы, у апошнім можна пазнаёміцца з музыкам Мар'янам Скрамблевічам. Ён не толькі сыграе, але і правядзе для ўсіх ахвотных майстар-клас.

***— На экскурсіях бываюць палякі, украінцы, расіяне, немцы... У чым сакрэт папулярнасці?***

— Мы знаёмім вандроўнікаў з аўтэнтычнымі промысламі і вясковым жыццём на Гродзеншчыне. Прывозім туды, дзе захаваліся нацыянальныя звычаі і традыцыі. Нашы экскурсіі знаёмяць з сапраўдным беларускім побытам, у які можа акунуцца кожны ахвотны. Майстры навучаць каваць, ляпіць гаршкі, выразаць па дрэве. Пасля займальных урокаў мы запрашаем усіх пакаштаваць стравы нацыянальнай кухні. Ад нашых клёцак і дранікаў яшчэ ніхто не адмаўляўся!

Паралельна расказваем турыстам гісторыю краіны. Многія цікавяцца, як жылі на беларускіх землях раней. З дапамогай картаў і атласаў запаўняем адукацыйныя прабелы — атрымліваецца такое міні-падарожжа ў мінулае. Дарэчы, нашы прапановы па кашальку не б'юць, звычайна можна ўкласціся ў 300-400 тысяч рублёў. Адзначу, што сёння турысты больш патрабавальныя і пераборлівыя. Мала прывесці іх да нас — трэба зрабіць так, каб яны захацелі вярнуцца.

***— Але ж адной праграмы для гэтага недастаткова....***

— Варта пашыраць маршруты, раскручваць новыя цікавыя аб'екты. У Беларусі шмат аграсядзіб. Але сёння мала проста здаць гасцям хатку, прапанаваць ім пайсці на рыбалку ці пакатацца на веласіпедзе. Трэба дапаўняць адпачынак культурнай праграмай, знаёміць гасцей з нашымі абрадамі і звычаямі, нацыянальнай кухняй. За мяжой экскурсіі пабудаваныя на інтэрактыве, анімацыі, гульні. Напрыклад, турыстам паказваюць непрыглядны аб'ект, але пры гэтым маляўніча прэзентуюць яго гісторыю. Адным расповедам там не абмяжоўваюцца, цябе зацягваюць у «Спектакль», і ты літаральна трапляеш у падзеі далёкай эпохі. У нас шмат шыкоўных месцаў! Беларуская зямля — сапраўдная скарбніца легенд, гісторый і міфаў.

**Хрысціна ХІЛЬКО.**